**Гарбачоў, М.** Баявыя вехі / М. Гарбачоў // Лепельскі край. — 2014. — 14 лют. — С. 2.

# БАЯВЫЯ ВЕХІ



**Важнейшымі вехамі ў асабістым жыцці Леаніда Бартко сталі паступленне ў 1982 годзе на вучобу ў Лепельскі гідрамеліярацыйны тэхнікум на спецыяльнасць тэхніка-механіка і прызыў вясной 1983 года на тэрміновую службу ў армію.**

Менавіта пасля гэтых падзей Леанід Станіслававіч паірапіў у «вучэбку» ў Ашхабадзе, прысвоілі воінскае званне малодшага сяржанта, у кастрычніку быў ужо на тэрыторыі Афганістана ў складзе абмежаванага кантынгента савецкіх войск.

– Прызначылі камандзірам аддзялення БМП (баявая машына пяхоты) 149-га гвардзейскага мотастралковага палка, размешчанага ў правінцыі Кундуз, – успамінае Леанід Бартко. – У нашым мотастралковым узводзе налічвалася тры БМП, і па штатным раскладзе павінна было быць не менш за трыццаць ваеннаслужачых, але з-за недастатковага папаўнення навічкам, улічваючы баявыя страты, звычайна ва ўзводзе ваявала не больш за 20-22 салдаты.

– Прывядзіце прыклад адной з баявых аперацый…

– Летам 1984 года стала вядома аб маршруце руху варожага каравана з боку Пакістана. Для яго знішчэння была накіравана наша мотастралковая рота. Спачатку мы доўга ехалі на БМП. Потым пешшу яшчэ каля двух кіламетраў рухаліся наперад.

У руках на пагатове была стралковая зброя. Прыцемкам дабраліся да месца прызначэння. Заляглі ў засаду. Чакалі да трох часоў ночы. Толькі тады пачулі глухі тупат конскіх капытоў. Убачылі ў начной цемры постаць людзей і не менш за 25 коней, на якіх з абодвух бакоў віселі вялікія сумкі з грузам. Душманы вялі сябе бяспечна, нават перагаворваліся на хаду. Па загадзе камандзіра адкрылі агонь. Большасць ворагаў знішчылі. Тыя, што ўцалелі, у паніцы разбягаліся ў розныя бакі, улічваючы начную цемру. Захапілі шмат зброі і боепрыпасаў, якія былі прывезены для папаўнення душманскіх боезапасаў. Аўтаматы былі яшчэ ў заводскай упакоўцы і змазцы, зусім новыя, якія не выкарыстоўвалі раней ў баявых дзеяннях.

– Праводзілі толькі наступальныя аперацыі?

– Вялі і працяглыя абарончыя баі пры нападзе душманаў на нашы пазіцыі. У 1984 годзе на поўначы Афганістана ў Панджшэрскай цясніне, каб адбіць атаку сіл ворага, што пераўзыходзіў нас, камандаванню нашых войскаў давялося задзейнічаць не толькі баявыя верталёты, якія меліся ў наяўнасці, але нават і самалёты Міг.

– Якімі баявымі ўзнагародамі былі ўшанаваны за ўдзел у канкрэтных баявых аперацыях?

– Медалямі «За адвагу» і «За баявыя заслугі».

– Як склалася жыццё пасля вяртання з Афганістана?

– У маі 1985 года вярнуўся дадому. Прадоўжыў вучобу ў Лепельскім гідрамеліярацыйным тэхнікуме, які закончыў у 1987 годзе. Працаваў у Пастаўскім ПМК-49.

У 1989 годзе ажаніўся на сваёй аднакурсніцы Вользе Кубар з вёскі Поплаўкі. Доўгі час жылі ў доме яе бацькоў. Потым як воін-інтэрнацыяналіст атрымаў двухпакаёвую кватэру з усімі зручнасцямі ў шматпавярховым доме ў Лепелі. Сын Дзяніс служыць міліцыянерам у Лепельскім аддзле Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь.

У снежні 1990 года ўладкаваўся на працу экскаватаршчыкам у філіял «Лепельскае дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 202». На жаль, у апошнія гады пагоршыўся стан майго здароўя, у тым ліку ўзніклі вялікія праблемы са зрокам. Пажыццёва ўстаноўлена трэцяя група інваліднасці. Хутчэй за ўсё, гэта адгукаюцца наступствы майго ўдзелу ў вайне ў Афганістане.

**Мікалай Гарбачоў**

**На здымку:** *Леанід Бартко*

**Фота аўтара**